ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 1 2016
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

## *ГІСТОРЫЯ*

*УДК 94(476)«1921/1927»*

*В. В. ДАНІЛОВІЧ*

# МОЛАДЗЬ У СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ (1921–1927 гг.)

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, Беларусь, e-mail: danilovich_v@mail.ru*

Статья посвящена исследованию проблемы участия молодежи в сельском хозяйстве Советской Беларуси в период осуществления новой экономической политики. Молодое поколение активно привлекалось к проведению ее мероприятий. Основным организатором выступал комсомол. В связи с расслоением крестьянства и демографическими изменениями юноши и девушки все более активно включались в хозяйственную деятельность на селе. Стабильно росло количество юных батраков. Постепенно увеличивалось количество молодых рабочих совхозов. Формы участия комсомола в хозяйственной жизни села с каждым годом становились все более разнообразными. С 1923 г. при сельских комсомльских ячейках началось создание сельскохозяйственных кружков, в работу которых были втянуты тысячи юношей и девушек. В 1924–1925 гг. регулярный характер приобрела мобилизация комсомольцев для работы на селе. Начала расти заинтересованность сельских комсомольцев, крестьянской молодежи в улучшении своего материального положения через получение практических, необходимых в хозяйстве знаний. Однако экономическая деятельность комсомола на селе велась непланово, не всегда была приспособлена к хозяйственным условиям регионов. Слабо собирался и распространялся лучший опыт комсомольских ячеек и отдельных комсомольцев. В целом организация участия молодежи в сельскохозяйственном производстве БССР оставалась еще далекой от идеальной.

*Ключевые слова:* Советская Беларусь, молодежь, компартия, комсомол, сельское хозяйство, новая экономическая политика, крестьяне, сельскохозяйственные рабочие.

*V. V. DANILOVICH*

**YOUTH IN THE AGRICULTURAL ACTIVITIES OF THE SOVIET BELARUS (1921–1927)**

*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus, e-mail: danilovich_v@mail.ru*

Author of the article investigated the problem of youth participation in agriculture of Belarus in the Soviet period of the New Economic Policy. Younger generation was actively involved in the conduct of its undertakings. Komsomol acted as a main organizer of this work. In connection with the stratification of peasantry and demographic changes both boys and girls becoming more actively involved in the economic activities in rural areas. Steadily grew the number of young farmhands. The number of young farm workers gradually increased, too. Every year forms of participation in the economic life of the Komsomol village became more and more diverse. Since 1923, the rural Komsomol cells began the creation of agricultural circles, in which were involved thousands of boys and girls. In 1924–1925 years, regular mobilization of Komsomol got to work in the countryside. Both rural Komsomol and peasant youth interest to improve their financial situation by getting practical knowledge, necessary in the economy of knowledge, started to grow.

However, economic activities of the Young Communist League in countryside conducted unplanned. It was not always adapted to the economic conditions of the regions. Best practices of Komsomol cells and individuals have been collected and disseminated poorly. In general, the organization of youth participation in agricultural production in the Byelorussian SSR remained far from ideal yet.

*Keywords:* Soviet Belarus, youth, Communist party, Komsomol, agriculture, New Economic Policy, peasants, farm workers.

Як вядома, у разглядаемы перыяд большасць насельніцтва Савецкай Беларусі, а значыць, і маладога пакалення пражывала ў сельскай мясцовасці. Зразумела, юнацтва не маглі не закранаць сацыяльна-эканамічныя змены, якія там адбываліся.

© Даніловіч В. В., 2016

З пачаткам новай эканамічнай палітыкі савецкія ўлады на вёсцы актыўна сталі прыцягваць юнакоў і дзяўчын да збору харчпадатку [1, л. 58]. Асноўным рухавіком у гэтай справе выступаў камсамол. Так, у чэрвені 1921 г. КСМБ у рамках кампаніі харчпадатку правёў 16 сходаў юных сельскіх жыхароў і 4 агульныя сходы, 2 гутаркі, 2 дыскусіі, 1 палітсуд, выпусціў 2 друкаваныя агітацыйныя старонкі [2, л. 12]. Гарадскія камсамольскія ячэйкі Савецкай Беларусі накіравалі на сяло для правядзення агітацыйна-прапагандысцкай працы 78 камсамольцаў [3, с. 10]. Актыўна ўдзельнічаў саюз і ў кампаніі па збору харчпадатку і ў 1922 г. [4, л. 1–2].

Акрамя гэтага, камсамольцы дапамагалі ўладам упарадкаваць землекарыстанне, пераразмяркоўваць зямлю на карысць беднага сялянства, аказвалі ўсебаковую дапамогу маламаёмасным сялянам і сем'ям чырвонаармейцаў [5, с. 108].

Яшчэ адным важным напрамкам дзейнасці камсамола ў галіне сельскай гаспадаркі было правядзенне пасяўных кампаній. Так, у сакавіку 1921 г. КСМБ супрацоўнічаў з павятовымі пасяўкамамі і ажыццявіў мабілізацыю моладзі на курсы пры іх [6, л. 3].

У ЦК саюза існавала і пасада інструктара па саўгасах. Увогуле ў 1921 г. да сельскагаспадарчай працы ў саўгасах ССРБ прыцягваліся дапрызыўнікі ў адпаведнай чарговасці: спачатку беспрацоўныя рабочыя, затым асобы без пэўных заняткаў і спекулянты, а ў апошнюю чаргу – вучні (пераважна добраахвотна) [7, л. 26; 8, л. 20]. Гэта сведчыць пра наяўнасць недахопу працоўнай сілы ў саўгасах.

У 1921–1922 гг. камсамольскія арганізацыі Савецкай Беларусі прымалі актыўны ўдзел у разгортванні меліярацыйных работ, прыцягвалі да ўдзелу ў гэтай справе маладых і дарослых сялян [9, с. 195].

Камсамол арганізоўваў абмеркаванне хвалюючых сялянскае юнацтва пытанняў на валасных і павятовых маладзёжных канферэнцыях [3, с. 12].

Нягледзячы на складанае сацыяльна-эканамічнае становішча, дзяржава асаблівую ўвагу надавала падрыхтоўцы з юнакоў і дзяўчын праз сетку курсаў і школ аграномаў і спецыялістаў па арганізацыі сельскай гаспадаркі [10, л. 32].

Аднак у цэлым у 1922 г. на вёсцы адзначалася пагаршэнне сацыяльна-эканамічнага становішча юнага пакалення. Таму, каб палепшыць сваё матэрыяльнае становішча, вясковая моладзь усё больш актыўна ўключалася ў гаспадарчую дзейнасць. У першую чаргу гэта тычылася маладых сялян. У саўгасах па-ранейшаму адчуваўся вялікі недахоп рабочых [11, л. 18, 41], што можна патлумачыць насцярожаным стаўленнем юнацтва да працы ў гэтых гаспадарках.

З 1923 г. пры многіх вясковых ячэйках КСМБ былі створаны спецыяльныя сельскагаспадарчыя гурткі, у працу якіх былі ўцягнуты тысячы юнакоў і дзяўчын. Праводзіўся ўлік самастойных камсамольцаў-гаспадароў. Тыя з іх, якія дрэнна працавалі ў сваёй гаспадарцы, востра крытыкаваліся. Аднак, зразумела, большасць членаў саюза працавалі ў гаспадарках сваіх бацькоў. Камсамол пачаў праводзіць дзень ураджаю, нядзельнікі па ахове лясоў (летам гэта праца ўвогуле вялася сістэматычна), разгарнуў працу па ўкараненні ў сельскую гаспадарку навуковых рэкамендацый і перадавога вопыту [5, с. 110–111, 142–143; 9, с. 151, 191–194; 12, с. 7; 13, с. 46–47; 14, с. 218; 15, л. 16; 16, л. 22].

Напрыклад, у лістападзе 1923 г. КСМБ правёў дзень ураджаю ў Барысаўскім і Мінскім паветах. У першым – добра, а ў другім – не вельмі, паколькі ў акцыі не ўдзельнічалі савецкія і партыйныя арганізацыі [17, л. 57], што сведчыць аб адсутнасці ў саюзе сістэмнай каардынацыі з імі падобных мерапрыемстваў.

Камсамольскія ячэйкі арганізоўвалі брыгады ўзаемадапамогі, якія дапамагалі ўдовам, інвалідам і беднякам апрацоўваць зямлю. У дні веснавой сяўбы камсамольцы праводзілі нават спецыяльныя нядзельнікі [18, с. 43].

Неабходна адзначыць, што асабліва шмат юных асоб ва ўзросце да 20 гадоў было сярод батракоў (да 90 %). З-за вельмі нізкай аплаты іх праца шырока выкарыстоўвалася ў невялікіх гаспадарках. Сярод моладзі з ліку парабкаў мелася вялікая колькасць сірот, бежанцаў з галадаючых раёнаў, а таксама дзяцей батракоў і сялян. У некаторых заможных сялян працавалі па 2–3 парабкі. Эканамічнае сановішча батракоў было цяжкім, адсутнічала ўсялякае рэгуляванне іх працы і яе аплаты. Памер заробку ўстанаўліваўся па вуснай дамоўленасці і залежаў ад заможнасці гаспадара, полу, узросту і колькасці працы. Аплата магла быць натуральнай: хлебам, адзеннем, жыллёвым

памяшканнем і харчаваннем. Пастухі працавалі пераважна сезонна, а парабкі на гаспадарцы – памесячна. Сярэдні заробак пастуха за лета быў у заможнага селяніна – 20, у серадняка – 12, у бедняка – 5 пудоў зерня. Сярэдняя зарплата батрака на гаспадарцы за месяц складала: у заможнага селяніна – 3, у серадняка – 1–1,5 пуда зерня. Працоўны дзень парабкаў быў ненармаваны. Пастухі-падлеткі ўвогуле працавалі без выхадных. У такіх умовах маладых батракоў асабліва хвалявала паляпшэнне свайго матэрыяльнага становішча [19, л. 39].

У большасці парабкі мелі сацыяльную страхоўку. Аднак яна моцна абцяжарвала сялян і тармазіла ўздым аплаты працы батракоў, бо вылічвалася не зыходзячы з заробку, атрыманага імі, а з ідэальнай зарплаты па стаўках прафсаюза. У выніку, калі парабак за сезон атрымаў 5 пудоў зерня, то яго сацыяльная страхоўка за гэты час складала 21 пуд зерня (палова ўраджаю селяніна-бедняка). Пры гэтым сялянам забаранялася датэрмінова звальняць батракоў-падлеткаў. Разам з тым сацыяльнае страхаванне батрацкага юнацтва не заўсёды было арганізавана належным чынам. Дрэннае становішча ў гэтай справе адзначалася, напрыклад, у кастрычніку 1923 г. у Мінскім павеце [17, л. 49].

Са свайго боку камсамольскія ячэйкі сачылі за выкананнем сялянамі ў адносінах да юнакоў і дзяўчын з ліку парабкаў дагавораў найму, устаноўленых законам умоў аплаты і прадастаўлення ім дзён адпачынку, не дазвалялі ўжываць у адносінах да іх фізічную сілу [5, с. 111; 13, с. 46; 20, с. 2].

У саўгасах жа з-за недахопу працоўнай сілы нарэшце здолелі ў значнай ступені прыцягнуць юнае пакаленне да адбудовы гаспадарак [21, л. 88].

Але далёка не ўся вясковая моладзь нават у саўгасах была ахоплена камсамольскай эканамічна-прававой працай. Асабліва слабай была гэта работа сярод падлеткаў-парабкаў. Да таго ж яны не былі ахоплены і працай прафсаюза работнікаў зямлі і лесу [22, л. 46–47]. У 1923 г., як паказвалі апытанні, многія батракі нават не ведалі пра існаванне камсамола [19, л. 35].

Камсамольскія арганізацыі пачалі надаваць увагу і папулярызацыі вынікаў сельскагаспадарчай працы. Так, напрыканцы ліпеня 1923 г. КСМБ прыняў удзел у падрыхтоўцы сельска-гаспадарчай выставы ў ССРБ [17, л. 4], пасля якой ЦК саюза накіраваў экскурсантаў-камсамольцаў на Усесаюзную сельска-гаспадарчую выставу ў Маскву [23, л. 78].

У 1924 г. з удзелам камсамольцаў прайшлі кампаніі па хлебнай пазыцы і збору сельскагаспадарчага падатку [24, л. 15; 25, л. 135].

З гэтага года ў шэрагу вёсак Савецкай Беларусі камсамольскім ячэйкам пачалі адводзіць па 1–2 дзесяціны, т. зв. «камсамольскія дзесяціны», якія па ініцыятыве маладога пакалення таксама пачалі называць «ленінскімі». Даходы ад іх ішлі на задавальненне калектыўных патрэб вёскі. Там, дзе з-за недахопу зямлі атрымаць дзесяціны не было магчымасці, камсамольцы ва ўласных гаспадарках стваралі вопытна-паказальныя ўчасткі. Ячэйкі камсамола праводзілі вялікую працу па добраўпарадкаванні вёсак. Формы ўдзелу камсамольцаў у гаспадарчым жыцці сяла з кожным годам рабіліся ўсё больш разнастайнымі. У вясковых ячэйках ЛКСМБ пачалі праводзіцца конкурсы на лепшую сельскагаспадарчую работу [25, л. 65]. Сельскім камсамольцам вялікую дапамогу аказвалі іх гарадскія таварышы. Напрыклад, Мінскі АК саюза арганізаваў пры клубе імя КІМ гурток для падрыхтоўкі сельскіх электрыфікатараў [9, с. 193–195].

Але камсамольскія ячэйкі ў цэлым яшчэ слаба ўдзельнічалі ў падняцці сельскай гаспадаркі, сярод камсамольцаў адзначалася шмат растрат, што падрывала давер сялян да камсамола [26, л. 44].

У гэты час адбываўся рост расслаення на вёсцы, што найперш адбівалася на юнацтве [27, л. 22]. Значна павялічылася колькасць юнакоў і дзяўчын сярод парабкаў і беднякоў [24, л. 16].

На 1 лістапада 1924 г. у БССР батракоў ва ўзросце да 23 гадоў налічвалася 6800 чалавек [28, л. 110].

У саўгасах з гэтага года было ўведзена браніраванне працоўных месцаў для падлеткаў у памеры 10 % [25, л. 131]. Усяго ж у саўгасах рэспублікі на той час працавалі толькі 248 падлеткаў. З іх 196 з'яўляліся членамі прафсаюза работнікаў зямлі і лесу. Увогуле ў гэтым прафсаюзе мелася 525 камсамольцаў. Заробак падлеткаў у саўгасах у сярэднім налічваўся па 2–3-му тарыфнаму разраду і складаў 8–12 руб. у месяц, але часта ён выплочваўся натурай [27, л. 16; 29, л. 80].

Рэгулярны характар набыла мабілізацыя членаў ЛКСМБ для працы на вёсцы.

Першапачаткова з 1 жніўня па 1 лістапада 1924 г. для працы на вёсцы былі мабілізаваны толькі 7 камсамольцаў-юнакоў: 3 (43 %) рабочыя, 1 (14 %) селянін, 3 (43 %) служачыя; 4 (57 %) беларусы, 2 (29 %) яўрэі, 1 (14 %) паляк; з камсамольскім стажам з 1918 г. – 1 (14 %), з 1920 г. –

3 (43 %), з 1921 г. – 1 (14 %), з 1923 г. – 2 (29 %); 5 (71 %) членаў і 2 (29 %) кандыдаты КП(б)Б; 2 (29 %) акруговыя работнікі саюза і 5 (71 %) раённых. Усім мабілізаваным была даручана работа на вёсцы раённага маштабу [30, л. 52]. Як бачым, сярод першых мабілізаваных камсамольцаў пераважалі беларусы, камуністы, выхадцы з рабочых, асобы з трохгадовым саюзным стажам і работнікі раённага ўзроўню. Зыходзячы з апошняга, можна нават канстатаваць, што адбылася не столькі мабілізацыя, колькі пераарыентацыя часткі раённых камсамольскіх работнікаў на курыраванне вясковай працы адпаведнага маштабу.

Напрыканцы снежня 1924 г. у камсамоле БССР пачалася чарговая мабілізацыя 50 гарадскіх актывістаў для працы на вёсцы: Мінск і Віцебск накіроўвалі па 10 чалавек, Бабруйск і Магілёў – па 7, Орша – 6, Барысаў і Мазыр – па 5 чалавек [25, л. 172]. Аднак гэтую развёрстку не выканалі на 2 чалавекі Мінскі, Аршанскі і Магілёўскі АК ЛКСМБ [31, л. 18]. Гэта сведчыць пра адсутнасць сярод членаў саюза паўсюднага энтузіязму ў гэтай справе.

Усяго на 1 студзеня 1925 г. было мабілізавана 44 чалавекі. З іх 24 (54 %) – сакратары бюро ячэек, 20 (46 %) – члены бюро ячэек, пры гэтым 16 з'яўляліся членамі РК, 6 – членамі АК, 1 – членам ЦК ЛКСМБ; 43 (98 %) юнакі і 1 (2 %) дзяўчына; 41 (93 %) з рабочых, 1 (2 %) з сялян, 2 (5 %) з батракоў; 37 (84 %) былі знаёмы з вёскай; 34 (77,2 %) беларусы, 7 (15,9 %) яўрэяў, 3 (6,9 %) іншых нацыянальнасцей (рускі, паляк і літовец); 27 (61 %) былі ва ўзросце 19–20 гадоў; 31 (70 %) мелі палітадукацыю 2-й катэгорыі, 13 (30 %) – 3-й катэгорыі; 7 (16 %) членаў і 29 (66 %) кандыдатаў КП(б)Б, 8 (18 %) беспартыйных; па стажу ў камсамоле 10 (23 %) – ад 6 да 3 гадоў, 29 (66 %) – ад 2 да 1 гадоў, 5 (11 %) – менш года; па стажу саюзнай працы 39 (89 %) ад менш 1 года да 2 гадоў; 32 (73 %) з'яўляліся членамі іншых грамадскіх арганізацый; па вытворчаму працоўнаму стажу 21 (48 %) – ад 5 гадоў і больш, 16 (36 %) – 1–2 гады, 7 (16 %) – 3–4 гады, пры гэтым большасць з'яўляліся чыгуначнікамі, папернікамі, металістамі і дрэваапрацоўшчыкамі [30, л. 54–55]. Як бачым, на другім этапе сярод мабілізаваных з'явіліся першыя дзяўчыны, а ўвогуле пераважалі беларусы, кандыдаты КП(б)Б, выхадцы з рабочых, сакратары бюро ячэек, асобы ва ўзросце 19–20 гадоў з палітадукацыяй 2-й катэгорыі, камсамольскім стажам ад 1 да 2 гадоў і стажам саюзнай працы да 2 гадоў, якія адначасова з'яўляліся членамі іншых грамадскіх арганізацый і мелі вытворчы працоўны стаж ад 5 гадоў і больш.

На 1 жніўня 1925 г. для працы ў вёсцы былі мабілізаваны яшчэ 40 членаў ЛКСМБ. З іх 21 (52,5 %) з ячэек, 15 (37,5 %) з РК і 4 (10 %) з АК; 38 (95 %) юнакоў і 2 (5 %) дзяўчыны; 37 (92,5 %) з рабочых, 3 (7,5 %) з іншых; 32 (80 %) былі знаёмы з вёскай; 19 (47,5 %) беларусаў, 15 (37,5 %) яўрэяў, 6 (15 %) іншых нацыянальнасцяў (2 рускія, 2 палякі і 2 літоўцы); 29 (72,5 %) былі ва ўзросце 19–20 гадоў; 28 (70 %) мелі палітадукацыю 3-й катэгорыі, 12 (30 %) – 2-й катэгорыі; 10 (25 %) членаў і 24 (60 %) кандыдатаў КП(б)Б, 6 (15 %) беспартыйных; па камсамольскаму стажу 8 (20 %) – ад 6 да 3 гадоў, 22 (55 %) – ад 2 да 1 года, 10 (25 %) – менш года; па стажу саюзнай працы 28 (70 %) ад менш 1 года да 2 гадоў; па вытворчаму працоўнаму стажу 24 (60 %) – ад 5 гадоў і больш, 13 (32,5 %) – 3–4 гады, 3 (7,5 %) – 1–2 гады. На працу ў вёскі рэспублікі, акрамя таго, прыбылі 12 камсамольцаў, мабілізаваных ЦК РЛКСМ [29, л. 12; 32, л. 5–7]. Вышэйзгаданае сведчыць, што на трэцім этапе сярод мабілізаваных захоўвалася ранейшая колькасць дзяўчын, а ўвогуле пераважалі беларусы, хаця іх колькасць і скарацілася, а колькасць яўрэяў вырасла больш чым у 2 разы, кандыдаты КП(б)Б, выхадцы з рабочых, актывісты з ячэек, асобы ва ўзросце 19–20 гадоў з палітадукацыяй 3-й катэгорыі, камсамольскім стажам ад 1 да 2 гадоў і стажам саюзнай працы да 2 гадоў, якія мелі вытворчы працоўны стаж ад 5 гадоў і больш. Да таго ж мабілізаваных беларускіх камсамольцаў яўна не хапала, таму ў БССР былі дадаткова накіраваны камсамольцы, мабілізаваныя ў РСФСР.

Мабілізаваныя 1 студзеня 1925 г. камсамольцы прайшлі 10-дзённыя курсы па азнаямленні з практыкай вясковага жыцця [31, л. 5]. З іх 19 (43 %) была даручана праца вясковага маштабу, 22 (50 %) – раённага, 3 (7 %) – акруговага. Пры гэтым большая частка мабілізаваных членаў саюза былі накіраваны ў Мазырскую (6), а найменшая – у Калінінскую (3) акругу. Па 5 чалавек былі накіраваны ў Барысаўскую, Мінскую і Полацкую акругі, а ў астатнія 5 акруг – па 4 чалавекі [30, л. 53]. З такога размеркавання можна зрабіць выснову, што найгорш вясковая праца камсамола была арганізавана ў Мазырскай, а найлепш – у Калінінскай акрузе.

З мабілізаваных на працу ў вёску 1 жніўня 1925 г. гарадскіх камсамольцаў-актывістаў толькі 6 былі накіраваны на вясковую працу, 32 – на раённую і 2 – на акруговую [32, л. 7].

Як бачым, у арганізацыі камсамольскай вясковай працы ў рэспубліцы ў 1925 г. найбольш не хапала каардынацыі на раённым узроўні.

Увогуле больш ¾ камсамольцаў-актывістаў былі мабілізаваны не па жаданні, а падабраны па сацыяльным, нацыянальным, партыйным складзе і дзелавых якасцях [30, л. 55]. Некаторыя з мабілізаваных з-за сацыяльных прычын не хацелі ехаць у вёску [31, л. 19]. Да таго ж не былі своечасова вызначаны месцы іх размеркавання, і яны працяглы час бяздзейнічалі. Адсутнічала таварыская падтрымка мабілізаваных з боку камсамольскіх арганізацый, якія іх накіравалі. Усё гэта вяло да ўпадніцкіх настрояў сярод мабілізаваных камсамольцаў. Увогуле многія з іх не справіліся з даручанай працай [33, л. 102]. Некаторыя дызерціравалі з вёскі [34, л. 175]. Некалькі мабілізаваных былі накіраваны назад у распараджэнне ЦК ЛКСМБ (прычым без узгаднення з ім, што абавязкова патрабавалася) як непрыдатныя для вясковай працы [35, л. 8]. Усё вышэйзгаданае сведчыць аб дрэнным падборы ў саюзе кандыдатур для мабілізацыі.

На 1 кастрычніка 1925 г. для працы ў вёсцы былі мабілізаваны яшчэ 32 члены камсамола: 21 (65,6 %) беларус, 8 (25 %) яўрэяў, 3 (9,4 %) іншых нацыянальнасцей; па сацыяльным паходжанні – 17 (53,1 %) з рабочых, 6 (18,8 %) з сялян, 1 (3,1 %) з батракоў, 8 (25 %) з іншых; 24 (75 %) актывісты ячэек, 3 (9,4 %) сакратары ячэек, 1 (3,1 %) сакратар РК, 2 (6,3 %) члены АК, 1 (3,1 %) інструктар АК, 1 (3,1 %) загадчык палітасветаддзела АК. Акрамя таго, у вёску былі накіраваны яшчэ 15 камсамольцаў, мабілізаваных ЦК РЛКСМ (амаль усім ім даручылі працу інструктараў АК і сакратароў РК). Непасрэдна з ЦК ЛКСМБ на вясковую працу (пераважна раённую: сакратарамі РК і ў палітасветаддзелы) было камандзіравана яшчэ 19 чалавек [36, л. 114–115]. Як бачым, на чацвёртым этапе сярод мабілізаваных пераважалі беларусы, актывісты ячэек, выхадцы з рабочых. Беларускаму саюзу таксама зноў спатрэбілася дапамога расійскага камсамола і нават у большым маштабе, чым на трэцім этапе.

Разам з тым у 1924–1925 гг. камсамольцы Савецкай Беларусі больш-менш рэгулярна працягвалі весці меліярацыйную працу: праводзілі нядзельнікі па рыцці асушальных каналаў і канаў, будаўніцтву гацяў, раскарчоўцы асушаных балот, арганізоўвалі здабычу торфу на паліва і ўгнаенне [5 с. 143–144; 9, с. 195–196].

Колькасць сельскагаспадарчых гурткоў у гэты час у БССР вагалася ад 300 да 500. Яны дзейнічалі амаль пры ўсіх вясковых ячэйках ЛКСМБ. У іх займаліся каля 10 тыс. чалавек (пераважна юных асоб). У гуртковай працы акрамя сялянскай моладзі ўдзельнічалі дэмабілізаваныя чырвонаармейцы і настаўнікі [9, с. 198; 29, л. 39; 31, л. 7].

Аднак мелася шмат выпадкаў, калі створаныя ЛКСМБ на вёсцы гурткі хутка развальваліся, кааператывы прагаралі, а камсамольцы не спраўляліся з даручанай працай. У выніку сяляне не давяралі саюзу [31, л. 9].

У 1925 г. камсамольцы прымалі актыўны ўдзел у працы зямельных камісій, дапамагалі праводзіць землеўладкавальныя работы па пераразмеркаванні лішкаў зямлі ад заможных да малазямельных сялян, у першую чаргу беднякоў і батракоў; нарыхтоўцы збожжа, наладжвалі суботнікі па ўборцы ўраджаю сем'ям чырвонаармейцаў і ўдовам [5, с. 139; 9, с. 179; 37, л. 52; 38, л. 68].

У сакавіку 1925 г. пачалі стварацца аб'яднаныя шэфтаварыствы рабочых над вёскай. Ячэйкі камсамола ўліліся ў іх працу і ўцягвалі ў шэфтаварыствы маладых рабочых і вучняў [33, л. 17].

У выніку кампаніі ЛКСМБ па ўзняцці вытворчасці працы меліся сотні фактаў ініцыятывы сялянскага юнацтва па паляпшэнні сельскай гаспадаркі [39, л. 81].

Але ў цэлым ячэйкі саюза слаба ўдзельнічалі ў працы па ўздыму сялянскай гаспадаркі, павелічэнні эканамічнага дабрабыту вёскі, стварэнні калгасаў. У камунах назіраліся хуткія выпадкі расчаравання і выхаду з іх юнакоў і дзяўчын. З аднаго боку, адзначаліся спробы камсамольцаў запалохваць, камандаваць і загадваць сялянамі, а з другога – вясковыя камсамольцы імкнуліся пераязджаць у горад з-за малазямелля і непрыбытковасці сялянскай гаспадаркі. Усё гэта падрывала аўтарытэт камсамола ў вачах сялян [31, л. 5, 11–12; 37, л. 4, 31, 45; 40, л. 58; 41, л. 6; 42, л. 15].

У 1925 г. у сельскай гаспадарцы БССР у час уборкі ўраджаю было дазволена падаўжэнне працоўнага дня для падлеткаў з умовай яго скарачэння ў іншыя перыяды ці выплаты кампенсацыі за адпрацаваны час [43, л. 78].

Увогуле ў 1925 г. падлеткі ва ўзросце да 18 гадоў складалі 50 % ад усіх батракоў рэспублікі: на 1 студзеня налічвалася 6388 падлеткаў-парабкаў, а на 1 ліпеня – 7902 (гэты рост можна растлумачыць як сезоннае павелічэнне). Дзяржава прадпрымала захады па пераводзе аплаты іх працы з натуральнай на грашовую. Заробак падлеткаў-батракоў паступова павялічваўся: на 1 студзеня ён складаў 2,5–3 руб., ці 50 % зарплаты парабкаў старэйшага ўзросту, а на 1 ліпеня – 4–5 руб., ці 63 %. Заробак батракоў ва ўзросце ад 18 да 23 гадоў быў роўны зарплаце дарослых парабкаў [39, л. 30–31].

У жніўні 1925 г. СНК БССР пастанавіў, што за батракоў 12–14-гадовага ўзросту працоўныя дагаворы павінны заключаць бацькі ці апекуны. Аднак ЦК ЛКСМБ выступіў супраць гэтай пастановы, за тое, каб гэтыя дагаворы заключаў прафсаюз работнікаў зямлі і лесу [44, л. 35], што сведчыць аб лабіраванні ім інтарэсаў прафсаюзаў.

Напрыканцы 1925 г. у БССР сярод 11621 юнага парабка (64 % ад агульнай колькасці батракоў) налічвалася 5345 (46 %) падлеткаў ва ўзросце да 16 гадоў. Працоўныя дагаворы мелі толькі 7448 (64 %) чалавек з моладзі парабкаў, але іх выкананне правяралася слаба. Усяго 1300 (11 %) маладых батракоў з'яўляліся членамі прафсаюза работнікаў зямлі і лесу. Зарплата батрацкага юнацтва па-ранейшаму залежала ад узроўню гаспадаркі наймальніка, узросту і полу парабкаў. У сярэднім па рэспубліцы яна складала 4,5 руб. у месяц, што было ніжэй дзяржмінімуму і, нягледзячы на ўсе захады, на 75 % мела натуральны характар (харчаванне, жыллёвыя памяшканні, абутак і адзенне). Пры гэтым аплата працы юных батракоў у моцных сялянскіх гаспадарках у сярэднім была ў 3 разы большай, чым у слабых [29, л. 63–64, 80; 45, л. 17; 46, л. 21; 47, л. 123].

У саўгасах жа БССР на 1 студзеня 1925 г. налічвалася 202 падлеткі ва ўзросце да 18 гадоў (2,6 % ад усіх рабочых), а на 1 ліпеня – 301 (3,5 %). Як бачым, у параўнанні з 1924 г. колькасць падлеткаў даволі значна вагалася. Запаўненне броні для падлеткаў па саўгасах складала каля 75 %. Пры гэтым нормы працы падлеткаў не ўсюды вытрымліваліся. Былі выпадкі падаўжэння іх працоўнага дня да 10 гадзін, як і ў дарослых рабочых. Заробак падлеткам плацілі па 1-му і 2-му тарыфных разрадах (7 руб. 75 кап. – 9 руб. 25 кап.), што складала 38,8–42 % ад зарплаты дарослых рабочых і было менш, чым у 1924 г. Юнакі і дзяўчыны ва ўзросце ад 18 да 23 гадоў складалі 10 % ад усіх рабочых саўгасаў і атрымлівалі заробак у такім жа памеры, як і дарослыя рабочыя [39, л. 31–32].

На 1 кастрычніка 1925 г. ва ўсіх саўгасах рэспублікі рабочых ва ўзросце да 23 гадоў налічвалася 1073 чалавекі (19 % ад усіх рабочых саўгасаў, за 9 месяцаў гэты працэнт вырас амаль у 2 разы). З іх 464 – падлеткі ва ўзросце да 18 гадоў (8 % ад усіх рабочых саўгасаў). За 3 месяцы іх колькасць вырасла больш чым на 50 %. Пры гэтым 327 падлеткаў працавалі па броні (70,5 %), з іх 45 былі пераросткамі (13,8 %). Зарплата юных рабочых саўгасаў з чэрвеня па жнівень 1925 г. вырасла ў сярэднім на 1 руб. 15 кап. Памеры заробку моладзі саўгасаў ваганіся ад 3-га да 5-га тарыфнага разраду (большасць прыходзілася на 3–4-ы разрады) і складалі 12–17 руб. У цэлым ён прыраўноўваўся да зарплаты дарослых рабочых. Зарплата ж падлеткам плацілася па 1–3-му разрадах (8–12 руб.) Сярод падлеткаў, якія працавалі па броні ў саўгасах, 18 % мелі 3-ці разрад, 70 % – 2-гі разрад, 12 % – 1-ы разрад [29, л. 64–65, 80]. Такім чынам, большасці падлеткаў заробак налічваўся па 2-му разраду.

Напрыканцы 1925 г. запаўненне броні для падлеткаў па саўгасах знізілася да 62 %. Пры гэтым меўся цэлы шэраг парушэнняў вызначаных заканадаўствам умоў працы падлеткаў: непрыдатнае жыллё; выкарыстанне на дапаможных працах; працоўны дзень летам часам павялічваўся да 10 гадзін; пераросткі доўга не пераводзіліся з броні ў штат; 55 % падлеткаў, працуючых па броні, навучаліся не па праграме і г. д. [33, л. 127].

У пачатку 1926 г. па БССР у саўгасах і на дапаможных тэхнічных прадпрыемствах пры іх 21 % ад усіх сельгасрабочых складалі маладыя асобы ва ўзросце да 23 гадоў (1091 чалавек: 870 юнакоў і 221 дзяўчына). Як бачым, рост іх колькасці працягваўся. Усе яны з'яўляліся членамі прафсаюза работнікаў зямлі і лесу. Аднак юнацтва слаба ўдзельнічала ў працы вытворчых нарад і камісій у саўгасах. Вялікая частка юных саўгаснікаў з'яўлялася палявымі рабочымі і атрымлівала заробкі па 5-му тарыфнаму разраду. Дзяўчыны працавалі галоўным чынам на скотных дварах і ў малачарнях. Іх праца аплочвалася па 3–4-му разрадах. Акрамя грошай саўгасная моладзь атрымлівала па 8 пудоў бульбы ў месяц, 1,5 л малака ў дзень, а таксама памяшканне для жылля з ацяпленнем [47, л. 119, 121].

У саўгасах рэспублікі на 1 ліпеня 1926 г. было 357 падлеткаў-браневікоў (9 % ад усіх рабочых саўгасаў), сярод іх перарасткаў – 21,5 %. Гэтыя лічбы сведчаць як аб росце ў параўнанні з 1925 г. працэнта падлеткаў сярод рабочых саўгасаў, так і аб росце колькасці падлеткаў-перарасткаў. Увогуле 55–60 % падлеткаў былі забраніраваны на дапаможных тэхнічных прадпрыемствах, што лічылася дрэнным, паколькі там адсутнічалі перспектывы пераводу падлеткаў у штат. У большасці саўгасаў заканадаўчыя нормы працы падлеткаў па-ранейшаму не вытрымліваліся. Маладыя саўгаснікі атрымлівалі зарплату пераважна па 5–6-му тарыфных разрадах. Сярэдні іх заробак вырас на 1 кастрычніка 1926 г. да 19 руб. 20 кап. [47, л. 120; 48, л. 49].

На 1 ліпеня 1926 г. у БССР налічвалася 14342 батракі ва ўзросце да 23 гадоў: 10756 (75 %) юнакоў, 3586 (25 %) дзяўчын; 8107 (57 %) ва ўзросце да 18 гадоў, 6235 (43 %) – 18–23 гадоў; 7947 (55 %) пісьменных і малапісьменных, 6395 (45 %) непісьменных; 2868 (20 %) з працоўным стажам 1–2 гады, 7170 (50 %) – 3–5 гадоў, 4304 (30 %) – 5–8 гадоў і вышэй; 3072 (21 %) членаў прафсаюза работнікаў зямлі і лесу; 1053 (7 %) членаў кас узаемадапамогі; 9036 (63 %) мелі працоўныя дагаворы. У батрацкіх камітэтах налічвалася 311 камсамольцаў, 32 камсамольцы-парабкі з'яўляліся членамі бюро кас узаемадапамогі. Сярэдні заробак юных батракоў у параўнанні з 1925 г. павялічыўся на 1 руб. 42 кап. [47, л. 122–123; 49, л. 16]. Як бачым, за паўгода колькасць батрацкага юнацтва вырасла амаль на 3 тыс. чалавек (гэта можна растлумачыць надыходам сезона вяснова-летняй працы). Сярод яго пераважалі хлопцы ва ўзросце да 18 гадоў з працоўным стажам 3–5 гадоў, амаль палову складалі непісьменныя асобы, колькасць членаў прафсаюза работнікаў зямлі і лесу ўзрасла больш чым у 2 разы, а колькасць парабкаў, якія мелі працоўныя дагаворы, больш чым на 1500 чалавек, аднак у працэнтных адносінах зменшылася на 1 %. Апошняе сведчыць аб пэўным замаруджванні тэмпаў пашырэння заключэння батракамі і іх гаспадарамі працоўных дагавораў.

Увогуле ў 1926 г. у рэспубліцы ў выніку актыўнай працы саўгасных, вясковых і мястэчковых ячэек ЛКСМБ уся саўгасная моладзь аказалася пад уплывам саюза, каля паловы яе сталі камсамольцамі [9, с. 196].

У гэтым годзе вясковыя арганізацыі камсамола вялі кампанію рэжыму эканоміі праз стварэнне паказальных участкаў сельскагаспадарчай вытворчасці (з выкарыстаннем у тым ліку машыннай апрацоўкі зямлі), асушэнне балот, барацьбу з бяскорміцай сельскагаспадарчай жывёлы. Арганізоўваліся камсамольскія сельскагаспадарчыя дружыны для дапамогі сялянам-беднякам. Расла зацікаўленасць камсамольцаў у паляпшэнні асабістай гаспадаркі, на ячэйках заслухоўваліся іх справаздачы аб працы ў сельскай гаспадарцы, вызначаліся канкрэтныя практычныя заданні. У шэрагу камсамольскіх арганізацый БССР былі праведзены нарады камсамольцаў-гаспадароў [29, л. 26–27; 50, с. 2; 51, л. 587; 52, л. 7]. Восенню 1926 г. ЦК ЛКСМБ правёў першы Усебеларускі конкурс на лепшы сельскагаспадарчы гурток (прэміяльны фонд конкурсу складаў 1265 руб.) [53, л. 138; 54, л. 213].

Аднак большасць камсамольцаў яшчэ не ўзяліся за практычную працу па паляпшэнні сваёй асабістай гаспадаркі, бо не ведалі практычных шляхоў, асабліва ва ўмовах трохполля. Кіраўніцтва гэтай справай не было сістэмным. Камсамольскія гаспадаркі амаль не адрозніваліся ад іншых сялянскіх гаспадарак, за нязначным выключэннем (Слуцкая акруга). Некаторыя ячэйкі і нават раённыя камітэты саюза надзвычай слаба ўдзельнічлі ў кампаніі па зборы сельгаспадатку. Увогуле эканамічная праца камсамола рэспублікі на вёсцы характарызавалася як слабая, асабліва сярод маладых парабкаў [34, л. 116, 162; 55, л. 7–8].

На гэты час толькі 53 % мабілізаваных камсамольцаў засталіся на працы ў вёсцы. Сярод іх былі выпадкі дызерцірства і катэгарычнага адмаўлення ад працы. Некаторыя мабілізаваныя зусім не адпавядалі той рабоце, на якую іх рэкамендавалі [51, л. 579]. Гэта яшчэ раз падкрэслівае дрэнны падбор мабілізаваных для работы на вёсцы камсамольскіх кадраў і адсутнасць у ЛКСМБ адладжанай сістэмы па арганізацыі вясковай працы саюза.

Сярод юнацтва заможных сялян у гэты час адзначалася імкненне да прыватна-ўласніцкай нажывы [45, л. 9].

Юнакі і дзяўчыны з ліку бядняцкага і серадняцкага сялянства імкнуліся палепшыць сваё матэрыяльнае становішча праз узняцце ўзроўню гаспадарання, атрыманне практычных, патрэбных у гаспадарцы ведаў. Аднак сярод юных сялян адзначалася незадаволенасць выдачай крэдытаў

пераважна сераднякам. Да таго ж у БССР адзначаліся праблемы з выдачай сельскагаспадарчых крэдытаў сем'ям чырвонаармейцаў тэрміновай службы [56, л. 70–71]. З-за дрэнных матэрыяльных умоў батрацкая і бядняцкая моладзь імкнулася пераехаць у горад. Падобнае імкненне назіралася і ў маладых сераднякоў [53, л. 100–101; 57, л. 8–9].

На 1 студзеня 1927 г. па БССР налічвалася 15660 батракоў ва ўзросце да 23 гадоў (67 % ад усіх парабкаў). З іх працоўныя дагаворы мелі 14722 (94 %) чалавекі, але яны заключаліся несвоечасова (праз 2–3 месяцы пасля найму) і ў значнай ступені былі нездавальняючай якасці. Па-ранейшаму адсутнічала сістэма праверкі выканання працоўных дагавораў [49, л. 15–16]. Як бачым, за паўгода колькасць батрацкага юнацтва вырасла амаль на 1,5 тыс. чалавек (і гэта нягледзячы на заканчэнне сезонных прац). Ахоп юных парабкаў працоўнымі дагаворамі вырас на 31 % і стаў амаль поўным. Гэта несумненны вынік зладжанага ўзаемадзеяння дзяржавы і грамадства ў дадзеным кірунку.

Рост колькасці моладзі сярод батракоў не спыняўся і далей. Так, напрыканцы 1927 г. у рэспубліцы налічвалася 20063 парабкі ва ўзросце толькі да 18 гадоў (25 % ад усіх батракоў) [58, л. 367]. Такое становішча можна патлумачыць як дэмаграфічнымі зрухамі, так і паляпшэннем матэрыяльнага дабрабыту сялян.

У параўнанні з 1926 г. сярэдняя штомесячная аплата працы падлеткаў-парабкаў у 1927 г. вырасла на 3 руб. у заможных і на 2 руб. у сярэдніх гаспадарках, прычым у заможных гаспадарках пераважна вырасла натуральная аплата (з 50 да 54 %), а ў сярэдніх – грашовая (з 35 да 43 %) [58, л. 369]. Але ўвогуле натуральная аплата працы падлеткаў-батракоў пераважала як у заможных, так і ў сярэдніх сялянскіх гаспадарках.

У саўгасах і іншых дзяржаўных сельскагаспадарчых прадпрыемствах БССР на 1 студзеня 1927 г. налічвалася каля 1330 юнакоў і дзяўчын (23 % ад агульнай колькасці сельскагаспадарчых рабочых) [48, л. 48]. Маладыя саўгаснікі рэспублікі пераважна атрымлівалі аплату працы па 4–5-му тарыфных разрадах. У саўгасах, нядаўна далучаных да БССР, Гомельскай і Рэчыцкай акруг заробак юнацтва быў ніжэй амаль на 17 %, яно не атрымлівала дадаткова малака і бульбы. Запаўненне броні для падлеткаў па саўгасах вырасла, але толькі да 75 %. Пры гэтым 61 % падлеткаў-браневікоў былі заняты не на сельскагаспадарчай вытворчасці, а на дапаможных тэхнічных прадпрыемствах, з іх 30 % складалі пераросткі. Як бачым, іх колькасць працягвала расці. Сярод падлеткаў-браневікоў 26 % атрымлівалі заробкі па 1-му разраду – 9 руб. 60 кап.; 26 % – па 2-му разраду – 11 руб. 52 кап.; 35 % – па 3-му разраду – 17 руб. 24 кап. і толькі 13 % – па 4–5-му разрадах. Аднак сістэматычныя праверкі кваліфікацыі падлеткаў у саўгасах не праводзіліся [48, л. 51–52; 49, л. 16, 18].

Актывізаваўся ўдзел ЛКСМБ у гаспадарчым жыцці сяла (землеўпарадкаванне, пасяўная кампанія, меліярацыя, каапераванне, праца па паляпшэнні дабрабыту вёскі, нарады камсамольцаў-гаспадароў і г. д.). Па ініцыятыве ячэек саюза ствараліся вытворчыя нарады па сельскай гаспадарцы, праводзіліся конкурсы на лепшую па грамадска-гаспадарчай рабоце вясковую ячэйку [59, л. 56].

Сярод камсамольцаў назіраліся масавыя пачынанні ў пераходзе да лепшых перадавых спосабаў вядзення ўласных гаспадарак: выхад на пасёлкі, ініцыятывы па пераводу на пасёлкі цэлых вёсак; пераход на шматполле (больш 60 камсамольскіх гаспадарак); вырошчванне лепшых парод жывёл, паляпшэнне догляду за імі; ініцыятыва ў асушцы невялікіх балотных участкаў; уцягванне ў актыўнае гаспадарчае будаўніцтва. У кожнай акрузе меліся дзясяткі выпадкаў удзелу вясковых камсамольцаў у выяўленні аб'ектаў падаткаабкладання. Але ўся гэта праца вялася няпланава, не заўсёды была прыстасавана да гаспадарчых умоў раёна. Не было канкрэтнага кіраўніцтва ёй з боку ячэек і камітэтаў камсамола. У ЛКСМБ слаба збіраўся і распаўсюджваўся лепшы вопыт ячэек і асобных членаў саюза. Недастаткова ўвагі надавалася меліярацыі, жывёлагадоўлі, торфараспрацоўкам. Значная большасць дасягненняў мелася ў гаспадарках камсамольцаў-сераднякоў, а камсамольцы-беднякі пераважна не імкнуліся штосьці змяняць у сваіх гаспадарках. У саўгасах адносіны камсамольцаў да працы таксама былі незаўсёды добрыя [49, л. 19, 21; 54, л. 212; 60, л. 11].

Камсамольцы ў значнай большасці былі ўцягнуты ў працу сялянска-рабочых камітэтаў. Увогуле моладзь складала 90 % ад усіх іх членаў. Але ячэйкі ЛКСМБ слаба дапамагалі працы камітэтаў, члены якіх у пераважнай большасці не мелі неабходнай кваліфікацыі [58, л. 368].

Агульны ўдзел саюза ў справе ўзняцця сельскай гаспадаркі па-ранейшаму лічыўся нязначным [61, л. 20].

У БССР налічвалася 312 сельскагаспадарчыя гурткі, якія аб'ядноўвалі 6326 чалавек, пераважна юнакоў і дзяўчын. Аднак актыўнасць іх у параўнанні з мінулымі гадамі зменшылася. Пераважна гурткі працавалі пры ячэйках камсамола, але меліся гурткі, якія дзейнічалі самастойна, што сведчыць аб захоўванні ў маладога пакалення сялян ініцыятывы ў іх стварэнні. Пры гэтым сталае сістэматычнае кіраўніцтва гурткамі з боку Галоўпалітасветкама рэспублікі і яго мясцовых падраздзяленняў адсутнічала [49, л. 24–25; 60 л. 8].

Увогуле ў сялянскага юнацтва назіраўся рост імкнення да вядзення сельскай гаспадаркі лепшымі спосабамі [62, л. 2]. Асабліва вялікую актыўнасць у справе паляпшэння сваёй гаспадаркі праяўлялі юныя серадdespite серадзякі, якія актыўна ішлі ў сельскагаспадарчыя гурткі. Бядняцкая моладзь была менш актыўна. Яшчэ менш актыўнічалі юнакі і дзяўчыны з ліку батракоў [54, л. 203].

Такім чынам, з пачаткам новай эканамічнай палітыкі савецкія ўлады на вёсцы актыўна сталі прыцягваць маладое пакаленне да ажыццяўлення яе мерапрыемстваў. Асноўным рухавіком у гэтай справе выступаў камсамол.

Камсамольцы таксама дапамагалі ўладам упарадкаваць землекарыстанне, аказвалі ўсебаковую дапамогу маламаёмасным сялянам і сем'ям чырвонаармейцаў, актыўна ўдзельнічалі ў пасяўных кампаніях, меліярацыйных работах, вялі працу па ўкараненні ў сельскую гаспадарку навуковых рэкамендацый і перадавога вопыту. Але ў пачатку 1920-х гг. адсутнічала сістэмная каардынацыя падобнай дзейнасці саюза з савецкімі і партыйнымі органамі.

З 1923 г. пры вясковых ячэйках камсамола пачалося стварэнне спецыяльных сельскагаспадарчых гурткоў, у працу якіх былі ўцягнуты тысячы юнакоў і дзяўчын. У сярэдзіне 1920-х гг. колькасць гурткоў у Савецкай Беларусі вырасла да 500. Яны дзейнічалі амаль пры ўсіх вясковых камсамольскіх ячэйках і аб'ядноўвалі каля 10 тыс. чалавек. Але ў 1927 г. колькасць гурткоў скарацілася да 312, а колькасць іх членаў – да 6326 чалавек. Разам з тым з'явіліся гурткі, створаныя сялянскай моладдзю самастойна без удзелу камсамольцаў. Такое становішча сведчыць аб аслабленні ўвагі саюза да гэтай працы.

У сувязі з расслаеннем сялянства і дэмаграфічнымі зрухамі юнацтва ўсё больш актыўна ўключалася ў гаспадарчую дзейнасць на вёсцы.

Стабільна расла колькасць маладых батракоў, што тлумачыцца і танным коштам гэтай працоўнай сілы. Эканамічнае сановішча парабкаў было цяжкім. Працяглы час адсутнічала ўсялякае рэгуляванне іх працы і яе аплаты. Зарплата юных батракоў была ніжэй дзяржмінімуму і, нягледзячы на ўсе захады дзяржавы, на 75 % мела натуральны характар. Пры гэтым аплата іх працы ў моцных сялянскіх гаспадарках у сярэднім была ў 3 разы большай, чым у слабых. Толькі у 1927 г. у выніку зладжанага ўзаемадзеяння дзяржавы і грамадства юнакі і дзяўчыны з ліку парабкаў на 100 % былі ахоплены працоўнымі дагаворамі.

Камсамольскія ячэйкі разам з прафсаюзам работнікаў зямлі і лесу сачылі за выкананнем сялянамі ў адносінах да батрацкай моладзі дагавораў найму, устаноўленых законам умоў яе працы. Але фактычна амаль да канца разглядаемага перыяду гэта дзейнасць не была сістэмна арганізавана.

Паступова павялічвалася і колькасць юнацтва сярод рабочых саўгасаў. З 1924 г. у саўгасах было ўведзена браніраванне працоўных месцаў для падлеткаў у памеры 10 % ад агульнай колькасці вакансій. Але колькасць падлеткаў-браневікоў на працягу разглядаемага перыяду не была стабільнай. Максімальнае запаўненне броні складала 75 %. Пры гэтым нормы працы падлеткаў часта не вытрымліваліся, не была адладжана сістэма пераводу падлеткаў-пераросткаў у штат. Таму працэнт іх у агульнай колькасці сярод падлеткаў-браневікоў стабільна рос.

Разам з тым формы ўдзелу камсамола ў гаспадарчым жыцці сяла з кожным годам рабіліся ўсё больш разнастайнымі. З 1924 г. у вясковых ячэйках ЛКСМБ пачалі праводзіцца конкурсы на лепшую сельскагаспадарчую работу. Вырасла дапамога сельскім камсамольцам з боку іх гарадскіх таварышаў.

Але ў цэлым камсамольскія ячэйкі яшчэ слаба ўдзельнічалі ў працы па ўздыму сялянскай гаспадаркі, павелічэнні эканамічнага дабрабыту вёскі, стварэнні калгасаў. Мелася шмат выпадкаў, калі створаныя саюзам на вёсцы гурткі хутка развальваліся, а кааператывы прагаралі, камсамольцы не спраўляліся з даручанай працай, імкнуліся камандаваць сялянамі. Гэта падрывала пазіцыі камсамола ў сялянскім асяроддзі.

У 1924–1925 гг. у Савецкай Беларусі рэгулярны характар набыла мабілізацыя камсамольцаў для працы на вёсцы. Усяго можна выдзеліць 4 яе этапы, у час якіх былі мабілізаваны 102 члены ЛКСМБ і 27 членаў РЛКСМ.

Сярод мабілізаваных камсамольцаў пераважалі беларусы, члены і кандыдаты КП(б)Б, выхадцы з рабочых. Аднак больш ¾ камсамольцаў-актывістаў былі мабілізаваны не па жаданні, а падабраны па сацыяльным, нацыянальным, партыйным складзе і дзелавых якасцях. Сярод іх былі выпадкі дызерцірства і катэгарычнага адмаўлення ад працы. Некаторыя мабілізаваныя зусім не адпавядалі той рабоце, на якую іх рэкамендавалі. У выніку ў 1926 г. толькі 68 мабілізаваных камсамольцаў засталіся на працы ў вёсцы. Такое становішча сведчыць аб дрэнным падборы мабілізаваных для работы на вёсцы камсамольскіх кадраў і адсутнасці ў камсамольскіх арганізацыях адладжанай сістэмы вясковай працы.

Толькі ў 1926 г. у БССР у выніку актыўнай працы саўгасных, вясковых і мястачковых камсамольскіх ячэек уся саўгасная моладзь аказалася пад уплывам саюза. З гэтага года пачала расці зацікаўленасць вясковых камсамольцаў, юнакоў і дзяўчын з ліку бядняцкага і серадняцкага сялянства ў паляпшэнні свайго матэрыяльнага становішча праз узняцце ўзроўню гаспадарання, атрыманне практычных, патрэбных у гаспадарцы ведаў. Асабліва вялікую актыўнасць у справе паляпшэння сваёй гаспадаркі праяўлялі маладыя сераднякі, якія актыўна ішлі ў сельскагаспадарчыя гурткі. Бядняцкае юнацтва было менш актыўным. Яшчэ менш актыўнічалі юныя батракі. Разам з тым з-за дрэнных матэрыяльных умоў батрацкая і бядняцкая моладзь імкнулася пераехаць у горад. Больш таго, падобнае імкненне назіралася ў юнакоў і дзяўчын з ліку сераднякоў і нават у камсамольцаў. Сярод маладых заможных сялян у гэты час адзначаўся рост імкнення да прыватнаўласніцкай нажывы.

Увогуле і ў 1927 г. эканамічная праца камсамола рэспублікі на вёсцы па-ранейшаму характарызавалася як слабая. Яна вялася няпланава, не заўсёды была прыстасавана да гаспадарчых умоў раёнаў. У ЛКСМБ слаба збіраўся і распаўсюджваўся лепшы вопыт ячэек і асобных камсамольцаў.

Таму арганізацыя ўдзелу юнацтва ў сельскагаспадарчай вытворчасці БССР заставалася яшчэ далёкай ад ідэальнай.

### Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 7.
2. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДАСПГ). – Ф. М-1. Воп. 23. Спр. 32.
3. Комсомол Белоруссии. Цифры и факты. – Минск: Беларусь, 1968. – 80 с.
4. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 12.
5. Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии. – Минск: Беларусь, 1975. – 536 с.
6. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 6.
7. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 11.
8. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 12.
9. *Журов, А.* Под руководством партии. Деятельность КПБ по созданию и руководству комсомолом Белоруссии (1918–1925 гг.) / А. Журов. – Минск: Беларусь, 1970. – 216 с.
10. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 5.
11. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 13.
12. Да IX з’езду ЛКСМБ. – Минск: Чырвоная зьмена, 1928. – 70 с.
13. *Жураў, А. Я.* У баях народжаны. Кароткі нарыс гісторыі камсамола Беларусі / А. Я. Жураў. – Мінск: Народная асвета, 1970. – 224 с.
14. Ленинский комсомол. – М.: Молодая гвардия, 1958. – 596 с.
15. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 23.
16. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 31.
17. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 24.
18. *Жураў, А. Е.* Комсамол Беларусі ў барацьбе за соцыялізм / А. Я. Жураў. – Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1957. – 76 с.
19. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 25.
20. Набат молодёжи. – 1923. – 28 мая.
21. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 22.
22. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 20.
23. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 13.
24. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 27.
25. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 33.

26. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 185.
27. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 41.
28. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 60.
29. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 54.
30. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 59.
31. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 37.
32. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 112.
33. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 49.
34. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 62.
35. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 89.
36. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 113.
37. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 121.
38. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 122.
39. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 44.
40. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 39.
41. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 59.
42. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 123.
43. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 45.
44. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 51.
45. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 46.
46. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 127.
47. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 211.
48. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 355.
49. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 66.
50. Комсомольская правда. – 1926. – 13 авг.
51. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 64а.
52. РДАСПГ. Ф. М-26. Воп. 1. Спр. 100.
53. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 53.
54. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 174.
55. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 210.
56. НАРБ. – Ф. 101. Воп. 2. Спр. 94.
57. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 58.
58. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 493.
59. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 358.
60. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 68.
61. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 306.
62. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 297.

*Паступіў у рэдакцыю 10.11.2015*